Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі
ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!
ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА
Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі
№109 (491) Чацьвер 29 верасьня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. №903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

ПРАЦЯГВАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ МІТЫНГ!

Першыя ластаўкі.

Прамова прадстаўніка рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“.

Пытаньне аб суботніку ўжо прайшло цяжкі шлях „абгаварэньняў“ і „тлумачэньняў“.

Мы ўжо бачым, як асобныя організацыі ў цэлым (Бабруйская акруга), ячэйкі ў асобку (завод „Чырвоная Зорка“, ячэйка статыстычнага кіраўніцтва, ячэйка працаўнікоў банкаўскіх установ і г. д.) падыйшлі практычна да ажыцьцяўленьня суботніку.

Нашы папярэджаньні наконт цяжкасьцяй, якія будуць сустракацца—апраўдаліся. Ня ўсюды гаспадарчыя працаўнікі ідуць на сустрач.

Калі ў адных установах (як курсы ЦІП'у, профшкола друкароў), адміністрацыя шчыра дапамагае, дык у другіх—абставіны больш халодныя.

У гэткіх выпадках уся надзея—на вынаходзтва, ініцыятыву саміх комсамольскіх ячэек. Трэба адзначыць добры [illegible]чын чыгуначнікаў з Маскоўска-Бе[illegible]скай чыгункі якія прыцягваюць [illegible] работы па адрамантаваньню ваго[illegible] дарослых рабочых.

Асобныя, у[illegible]ія, прыклады падрыхтоўкі ўжо ёсь[illegible], па іх трэба раўняцца ўсёй органі[illegible]цыі.

Цяпер—аб друг[illegible] пытаньні.

Суботнік у адзначэньні Кастрычнікавага сьвята займае адно з галоўных месц, але нам нельга запамятаць і пра астатнія моманты—сьвята.

Асяродак увагі ў гэтых адносінах прыходзіцца зьвярнуць на вёску, бо агульныя ўмовы для добрай падрыхтоўкі там больш цяжкія, чым у горадзе.

Але гэтыя некаторыя цажкасьці не павінны пужаць комсамольскія ячэйкі.

Вясковыя ячэйкі ЛКСМБ павінны зьявіцца першым і дапаможнікамі парт'ячэйкам.

Як у горадзе, так і ў вёсцы сьвята толькі тады добра пройдзе, калі ў яго будуць уцягнуты найшырэйшыя колы працоўных.

У масавасьці—галоўны посьпех сьвята. На мітынгу сёньня будзе абвешчана пастанова Цэнтральнай Кастрычнікавай Камісіі пры ЦВК БССР аб правядзеньні, сумесна з газэтай „Чырвоная Зьмена“, усебеларускага конкурсу вясковых ячэек ЛКСМБ.

Значэньне конкурсу ня толькі ў тым што некаторыя лепшыя ячэйкі атрымаюць прэміі.

Яго значэньне ў тым, каб узварушыць усю вясковую комсамолію, каб зрабіць занятнае не трафарэтнае афармленьне сьвята—галоўнай задачай бягучай работы.

У спаборніцтвах прымаюць удзел усе вясковыя ячэйкі, але ў рэшце кожны раён вылучае адну ячэйку для канчатковага ўдзелу ў конкурсе.

Вясковыя ячэйкі, сумесна з гарадзкімі, пакажуць прыклад упартасьці і ўменьня бадзёра, весела і цікава адзначыць славутую гадавіну.

КОНКУРС ВЯСКОВЫХ ЯЧЭЕК.

Хто лепш правядзе сьвята—атрымае прэміі.

КОНКУРС ПРАВОДЗІЦЬ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ СУМЕСНА З ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАСТРЫЧНІКАВАЙ КАМІСІЯЙ.

СТАРШЫНЯ МІТЫНГУ: Таварышы! Некаторымі ўдзельнікамі мітынгу было выказана пажаданьне, каб рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ організавала ўсебеларускі конкурс вясковых ячэек на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне Кастрычнікавага сьвята. У выніку перамоў з адпаведнымі ўстановамі я зараз агалашу наступную пастанову:

— Цэнтральная Камісія па правядзеньню 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі сумесна з рэдакцыяй газэты ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена» абвяшчае **ўсебеларускі конкурс** вясковых комсамольскіх ячэек на лепшую падрыхтоўку і ўдзел у Кастрычнікавых сьвятах.

Задача конкурсу—высьвятліць ініцыятыву комсамольскіх ячэек у справе найбольш прадуманага па сутнасьці і знадворна - аформленага ўдзелу моладзі ў сьвяце.

Пры разглядзе працы, праробленай ячэйкамі, якія ўдзельнічалі ў конкурсе будзе ўлічвацца наступнае: **1) наколькі добра праведзена папярэдняя падрыхтоўка; 2) у чым выявілася прыцягненьне як да падрыхтоўкі, так і да самога сьвята ўсяго працоўнага насельніцтва вёскі; 3) як быў падрыхтаваны і праведзены «суботнік» моладзі і яго конкрэтныя матар'яльныя вынікі; 4) наколькі па-новаму, без трафарэту і казёншчыны быў аформлены ўдзел моладзі ў дэмонстрацыі (карнавальныя групы, інсцэніроўкі і г. д.); 5) адбіцьцё сьвята ў асабовым быту моладзі (прыбраньне кватэр, новыя вопраткі, сьвяточныя сьнеданьні і г. д.); 6) адзнака 10-ці годзьдзя Кастрычніка якім-небудзь гаспадарчым ці культурным пачынаньнем (акрамя суботніку); 7) удалае правядзеньне таварыскай вячоркі ў гонар гадавіны Кастрычніку, якая павінна аб'яднаць у сябе няпрымушанасьць сумесна з адбіцьцём сьвята.**

Ячэйкам, якія лепей за астатніх правядуць падрыхтоўку і аформяць удзел моладзі ў сьвяце, будуць выданы наступныя прэміі:

1) Чатыры ячэйкі атрымаюць права абраньня з свайго асяродку па аднаму дэлегату для паездкі ў горад Маскву. Дэлегатам будуць поўнасьцю аплачаны ўсе пуцявыя выдаткі, сямідзённае прабываньне ў Маскве.

2) Дзьве ячэйкі атрымаюць набор спартыўных прыладаў.

3) Дзьве ячэйкі атрымаюць музыкальныя струманты.

4) Тры ячэйкі атрымаюць бібліотэкі з навейшых кніжак па ўсім галінам комсамольскай працы і навейшай бэлетрыстыкі, газэты „Комсомольская Правда“ і „Чырвоная Зьмена“ на год і на паўгода часопісі „Молодая Гвардия“, „Юный Коммунист“, „Маладняк“, „КІМ“, „Смена“ і „Журнал Крестьянской Молодежи“.

Прысуджэньне прэміі будзе праводзіцца спэцыяльнай камісіяй у складзе т. т. **А. Г. Чарвякова** (старшыня), **Бараньнікава, Ратнэра, Галавача і Курціка.**

5) Аўтары дзесяці лепшых корэспондэнцыяў аб падрыхтоўцы і ўдзелу моладзі ў сьвяце прэміруюцца часопісямі «Рабоче-Крестьянский Корреспондент» (на год) і «30 дней» (на паўгода) і газэтамі «Комсомольская Правда» і «Чырвоная Зьмена» (на год), а таксама бібліотэкамі з кніжак па пытаньнях корэспондэнцкае працы.

Для ўдзелу ў конкурсе ячэйкі павінны пачаць асьвятляць сваю падрыхтоўчую працу на старонках газэты «Чырвоная Зьмена», у спэцыяльна створаным для гэтай мэты аддзеле. Апісаньне афармленьня ўдзелу моладзі ў Кастрычнікавых сьвяткаваньнях павінна будзе, папярэдне, пацьвярджацца райкомамі ЛКСМБ, якія для гэтай мэты вылучаюць камісіі. У задачу камісіі пры райкомах ЛКСМБ уваходзіць вылучэньне адной ячэйкі з усяго раёну для ўдзелу ў Усебеларускім конкурсе.

Усе матар'ялы на конкурс прысылаюцца на адрас рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» (Комсамольская вул. 25, Менск) з паметкай «На конкурс».

Вынікі конкурсу і сьпіс ячэек і корэспондэнтаў, атрымаўшых прэміі, будзе апублікаваны ў апошніх лічбах лістападу.

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ і Цэнтральная Кастрычнікавая Камісія заклікаюць усе комсамольскія ячэйкі Беларусі прыняць удзел у конкурсе.

Старшыня Цэнтральнай Камісіі па правядзеньню Кастрычнікавай гадавіны.
А. Г. ЧАРВЯКОЎ.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ
А. БАРАНЬНІКАЎ.



Бабруйск рыхтуецца.

Прамова тав. Сандульскага.

Таварышы! Я лічу неабходным паведаміць слухачоў мітынгу аб тым, што мы—комсамолія Бабруйшчыны — рыхтуем да Кастрычніка. Мы ўжо ўзяліся за правядзеньне наступных 4 практычных мерапрыемств:

— 22-23 Кастрычніка ва ўсіх комсамольскіх ячэйках Бабруйскай акругі праводзіцца суботнік у карысьць бяспрытульных.

У працягу Кастрычніка організоўвацца акруговы падарунак падшэфнай роце лінейнага карабля «Парыская Камуна».

— Да дню ўраджаю (14-га Кастрычніка) па раёнах організоўваецца конкурс на лепшую вясковую ячэйку па гаспадарчай працы ў вёсцы. А к 10-цігодзьдзю Кастрычнікавай рэволюцыі організоўваецца такі-ж конкурс у акруговым маштабе. Удзельнічаюць у гэтым конкурсе тыя ячэйкі, якія прызнаны лепшымі на раённых конкурсах.

— Організоўвацца акруговы конкурс на лепшую вытворчую ячэйку па гаспадарчай яе працы ў вытворчасьці.

Па ўсіх гэтых пытаньнях ужо больш тыдню таму назад Акругком СМ разаслаў адпаведныя паказаньні па лініі ўсіх установ і ячэйкі ўжо прыступілі да працы.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў будзе адной з лепшых адзнак надыходзячага сьвята.

Усім АКРЗА БССР.

(Загад ад 24-га верасьня за № 18543).

Гэтым прапануецца прадаставіць працу ў суботнікі, якія організуюцца ЦК ЛКСМБ па ўсіх галінах сельскае і лясное гаспадаркі і ў прыватнасьці па мэліорацыі.

Таксама неабходна па кожнай акрузе тэрмінова прыслаць заяўку непасрэдна ў рэдакцыю «Чырвонай Зьмены» на магчымую колькасьць моладзі, якую на работах можна скарыстаць.

Намесьнік Наркому Земляробства **ВАЛОДЗЬКА.**
Нач. Адмін.-Орг. Кіраўніцтва **НАЙХІН.**

Ці падрыхтаваліся ячэйкі да суботніка, ці мае кожная работу.

Хто чакае, покуль «цыркулярна» ня прышлюць працу, а зараз-жа вышуквае яе.

(МЕНСК, ЯЧЭЙКА ЦСК).
Прамова т. Ляпіча.

Апошняе пасяджэньне бюро ячэйкі было цалком прысьвечана суботніку.

Покуль што мы выпрацавалі плян нашага ўдзелу ў суботніку. У нас ёсьць бібліотэка, у якой шмат кніг (8-9 тысяч томаў), якія не пранумараваны, не пералічаны.

Наша ячэйка у суботнік будзе занята па прывядзеньні ў парадак бібліотэкі. Другая праца ў архіве, трэба адабраць патрэбныя ад непатрэбных матар'ялы, падлічыць, раскласьці па гадох, зашыць у рагожы і г. д.

Вось наш удзел.

Зараз мы яшчэ высьвятляем, якія работы можна знайсьці і для іншых ячэек. Высьвятляецца становішча у акр. стат. бюро, якое абяцае даць невялічкую працу.

У суботнік уцягваем і піонэраў (бязумоўна толькі старэйшага ўзросту).

Падрыхтоўку мы распачалі своечасова, спадзяемся, што і суботнік пройдзе добра.

Мы даем працу вярбоўшчыкам заёму індустрыялізацыі.

Прамова т. Барташэвіча
(Загадчык галоўнай касы ашчаднасьці).

Таварышы!

Суботнік комсамолу ў вёсцы, правядзе шэраг такіх мерапрыемстваў, якія падымуць яе культурнае становішча.

Шэраг работ, кампаніяў і гутарак пачуе кожная вёска ў дні суботніку.

Няхай хлопцы ў гэты дзень дапамогуць нам, няхай правядуць кампанію за выгаднасьць ашчаднай кніжкі.

Было б добра калі-б мы навербавалі падпішчыкаў «Чырвонай Зьмены»—якія маюць узносы ў ашчаднай касе.

Гэта ня цяжка правесьці; падпішчыкам, якія падпісаліся на паўгода, выдаецца ашчадная кніжка з першапачатковым узносам (25 і 50 к.).

Вось гэта адно мерапрыемства. Калі гэта выгадна, мы можам дагаварыцца з рэдакцыяй.

Мы яшчэ можам прадаставіць і **аплачываемыя работы** суботніку. Справа вось у чым. Няхай комсамольцы **правядуць індывідуальную і колектыўную падпіску на заём індустрыялізацыі.**

Камісыйныя будуць складаць ваш заробак.

Такія работы займуць хлапцоў, толькі тут патрабуецца спрытнасьць і ўпартасьць пераканаць каго небудзь у тым, што сапраўды заём яму неабходзен.

У самых-жа касах мала знойдзецца работ, правільней кажучы, мы мала зоймем хлапцоў на іх. Такое-ж становішча і ў Дзяржаўным банку, работ ён можа прадаставіць зусім мала.

Застаюцца толькі работы па **падпісцы на заём.** Мы спадзяемся, што комсамольцы возьмуцца за гэта.

Што кажуць сяляне.

Загадчык Дому Селяніна ставіць пытаньне аб ільну.

О, лён — грамада падтрымлівае. Лён ня сходзіць з вуснаў. І абгаварваецца доўга, па гаспадарскі..

Лён патрабуе заграніца, лён патрэбен нашым фабрыкам, а сеюць мала, сеюць дрэнна. Лён можа павялічыць прыбытак кожнай гаспадаркі.

Дзядзькі з Барысаўшчыны

гавораць, што ў мінулым годзе яны засеялі, але прадалі за дзяшоўку. .

— Дарма прапала праца і поле.—Ня так шкадуюць працы, як зямлі.

На рэшце згаджаюцца, што ў гэтым самі вінаваты, бо няўмеюць **апрацаваць добра.**

І вось просяць наставіць працу так, каб да 10 гадавіны Кастрычніка іх **навучылі сеяць**, навучылі **апрацоўваць.**

Апошнім пытаньнем нарады зьяўляецца пытаньне

аб швэйных машынах.

Здаецца, якія адносіны маюць, швэйныя машыны да... дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.

Але тры хвіліны прысутнасьці на нарадзе сказалі-б шмат чаго, сказалі-б, што швэйныя машыны маюць простыя адносіны да Кастрычніка.

Швэйныя машыны патрэбны вёсцы. За імі прыяжджаюць аж за 500 вёрст, трацяць лішніх 30 р. і усё-ж каб здабыць машыну.

А машын няма.

Яны ёсьць толькі ў Менску, Маскве, ну і яшчэ ў некалькіх «буйных цэнтрах»!

За машынамі прыехала шмат людзей. І яны найстойліва патрабуюць пусьціць **машыну ў акруговы цэнтр, раён,** каб ім ня прыяжджаць, ня траціць дарма грошай.

Нарада скончылася, дзядзькі павязуць у вёскі новыя словы, запалы і жаданьні. Так добра сустрэты **суботнік** тут, павінен так-жа добра прайсьці і там на «мясцох».



Абутковая фабрыка.

ДРУГІ ДЗЕНЬ НАШАГА АГЛЯДУ.

МОЛАДЗЬ У ВЫТВОРЧЫМ ЖЫЦЬЦІ.

Чакаем водгукаў на зьмяшчаемыя сёньня допісы.

Агляд ідзе.

(Малюнкі).

Толькі што фабрычны гудок апавясьціў аб сканчэньні работы. Натоўп рабочых уваліўся ў пакой выязной рэдакцыі. Кожны ў руках трымае сьвежы нумар „Чырвонай Зьмены“, у ім чытаюць аб сваёй фабрыцы, аб першым дні яе агляду, робяць свае заўвагі.

Хлопцы з нацяжнога аддзяленьня яшчэ раз прышлі паскардзіцца на „пяціхвілінныя вымовы“ ў сваім цэху. За сталом сядзіць майстар дыктуючы юнкору адказ на зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене“ допіс.

Усюды пішуць, толькі і гавораць на фабрыцы аб аглядзе.

Дзяўчынка, бронь-вучаніца, падаючы допіс, з ухмылкай кажа: калі гэты пойдзе—напішу яшчэ.

Юнкоры фабрыкі—на „ваенным становішчы“. Яны ўвесь час бегаюць і „разнюхваюць“ што небудзь новае ў цэхах. Допісаў ужо шмат, цэлая кіпа.

Цяжка братву адарваць ад пакою выязной рэдакцыі. У таварыскіх абставінах тут ідуць самыя ажыўленыя гутаркі аб запатрабаваньнях вытворчасьці і жыцьці рабочых. Яны хочуць, каб усё гэта знайшло свой адбітак у газэце.

... А вось Ліўшыц, малады рабочы, стаіць і хмурыцца. Ён, наогул, ня верыць ва ўсялякія агляды, у дапамогу газэты. Хлапцы пакрываюць словы „пэсімістага“ дружным рогатам.

* * *

Агляд ідзе. Ён ужо ўзварушыў усю грамадзкасьць фабрыкі.

З 12 гадзін дню да 7 гадзін увечары да старога адрасу рэдакцыі прыбаўляецца яшчэ адзін: Нямігаўская абутковая фабрыка.

Гэты самы.

Дасягненьні ёсьць.

(у загатоўчым аддзяленьні).

Працэс работы ў нашым аддзяленьні ў значнай сваёй частцы—саматужны. Але паступова мэханізацыя даходзіць і да нас.

Нядаўна пастаўлена машына для аднačасовага выбіваньня дзірак і ўстаўленьня пістон. Гэта машына заменіць 3-4 чал.

Таксама адзначаю, як дасягненьне, што рабочыя маюць поўную нагрузку (у дзень цяпер выпрацоўваецца 350 пар).

Якасьць прадукцыі ў апошнія часы паднялася, яна цяпер значна вышэй, чым у мінулым годзе.

Рабочы М. Сагаловіч.

„Бронь“ цікавіцца работай.

(У загатовачным аддзяленьні)

Хачу і я сказаць некалькі слоў аб моладзі нашага аддзяленьня.

Прагулаў сярод яе няма.

Наглядаецца зацікаўленасьць «броні» ў добрым выкананьні даручаемай ёй працы. Калі параўнаць з мінулым годам, дык кваліфікацыя „броні“ значна павялічылася.

Некаторыя «браневікі» на мой погляд, працуюць ня горш чым дарослыя рабочыя.

Недахоп--тое, што адсутнасьць на фабрыцы неабходнай колькасьці некваліфікаваных рабочых прымушае скарыстоўваць «бронь» на гэтай рабоце. Майстар КРОЛЬ.

Неабходзен адзін фасон абутку.

(У загатоўчым аддзяленьні).

За апошнія два кварталы маецца значная эканомія ў кройцы тавараў. Раней на пару абутку трацілася 2,50 футаў матар'ялу, цяпер 2,45 футу. Вытворчасьць працы з мінулага году паднялася ад 250 пар у дзень да 350. Якасьць таксама палепшылася.

Але каб больш павысіць вытворчасьць працы і эканомію матар'ялу, неабходна стандартызацыя фабрыкі. Гэта значыць, **што неабходна перайсьці да выпрацоўкі абутку аднаго фасону.**

Недахопамі нашага аддзяленьня зьяўляецца яшчэ і тое, што **хром атрымліваецца са складу ня добрай якасьці.** Неабходна лепшая адборка хрому.

Таксама маецца некаторая незацікаўленасьць рабочых у кройцы тавараў.

Майстар КРОЛЬ.

Уносім карысныя прапановы.

Наведвае вытворчую нараду ня ўся моладзь фабрыкі.

Але ёсьць частка моладзі, якая цікавіцца нарадай, наведвае яе і ўносіць карысныя прапановы.

Напрыклад, таварыш К. Сагаловіч узьняў пытаньне на вытворчай нарадзе аб тым, што папсаванасьць машын адбіваецца на якасьці работы, робіць яе дрэннай.

У выніку куплена тры новыя машыны. Гэта дало магчымасьць наладзіць старыя.

Сагаловіч унёс таксама прапанову аб тым, каб не скарыстоўваць „бронь“ на падсобнай рабоце.

Прапанова была прынята, але ў жыцьцё яна яшчэ ня поўнасьцю праведзена.

Рабочы комсамолец
Баскін.

Ваганеткі будуць

Рабочы **Словуш** перадае нам аб вось якой ненармальнасьці на фабрыцы:

У нацяжным аддзяленьні зусім мала ваганетак, якія патрэбны для перавозкі іх ботаў. Шмат якія ваганеткі валяюцца паламанымі.

Дзякуючы гэтаму-справа даходзіць ледзь не да боек паміж рабочымі за ваганеткі. У вядомай меры кульгае ад гэтага і вытворчасьць працы.

Прадстаўнік выязной рэдакцыі гутарыў па гэтаму пытаньню з майстрам нацяжкога аддзяленьня тав. Шыманскім.

Апошні растлумачыў, што недахоп у ваганетках утварыўся таму, што фабрыка ў апошні час перайшла ад старой, 50 парнай сыстэмы ваганетак на новую 10 парную сыстэму. Ваганеткі новай сыстэмы ўжо гатуюцца і з новага бюджэтнага году яны будуць пушчаны ў ход.

„Падмазваюць клеем

(У нацяжным аддзяленьні).

Рабочыя аддзяленьня тав. **Камок** і іншыя кажуць, што быццам моладзь зацікаўлена ў вытворчасьці працы.

Трэба адзначыць, што моладзь нашага аддзяленьня ня досыць добра сябе вядзе:

— Кідаецца халатамі, падмазвае інструманты клеем. Праўда, гэта бывае ў часы, калі няма працы.

Дарослыя рабочыя затое і кажуць, што моладзь ня мае яшчэ той вытворчай дысцыпліны, якую павінен мець кожны рабочы.

Я лічу, што моладзі нашага аддзяленьня ўжо час пакончыць з гэткім ганебным зьявішчам.

Кац С.

„На вытворчыя нарады няма часу хадзіць“.

Комсамолец С. Кац, ён калісьці, па яго словам, рэгулярна наведваў вытворчыя нарады.

Спачатку, кажа ён, на вытворчых нарадах ставіліся пытаньні „наогул і ў прыватнасьці“, але паступова вытворчыя нарады пачалі займацца вырашэньнем больш канкрэтных пытаньняў работы таго ці іншага цэху і г. д.

Ад гэтага наведваньне іх рабочымі значна ўзьнялося.

Сам я, прызнаецца Кац, ніякіх добрых прапаноў на вытворчых нарадах не даваў! Ня было аб чым—гаворыць.

З наступленьнем восені, калі Кац паступіў на вучобу ў вячэрнюю школу павышанага тыпу, ён зусім закінуў вытворчую нараду. Некалі, кажа ён.

Ці сапраўды гэта так?—Хай скажуць свае слова па гэтаму астатнія комсамольцы фабрыкі.

Маленькія „Капабланкі“.

Лепшы вопыт піонэрскай працы.

(Віцебск).

За чорнымі простакутнікамі.

Гэта было ў часе 10-цігадовага юбілею Віцебскай комсамоліі. У 2-м Белдзяржтэатры, дзе адбывалася ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае юбілею, у лепкутку можна было бачыць, як вакол аднаго з столікаў згрупаваўся вялікі натоўп. Цэнтрам ўвагі ўсіх быў маленькі хлапчук—піонэр, які спакойна паглядаючы навокал, абыгрываў у шашкі ўсіх падыходзячых да яго. Ля століка, насупроць піонэра пабыло ўжо каля 10 чалавек, і ніводзін з іх ня вышаў адтуль з перамогай. Маленькі піонэрчык раз за разам выгульваў шашкі, партыі і ў лепшым выпадку яго супраціўнікі канчалі ў нічыю.

Навокал круцілі галовамі, зьдзіўлена пaглядалі на дошку з шашкамі і... знаходзіліся ўсё новыя і новыя, якія хацелі абгуляць здольнага хлапчука.

Нарэшце, адзін з комсамольцаў «усадзіў» піонэру дзьве шашкі і абгуляў. Натоўп гэта прывітаў воплескамі.

Калі «чэмпіён» устаў, я падышоў да яго. Мы хутка разгаварыліся.

Аказалася, што ён піонэр атраду працасьветы, акрамя яго ў шашкі гуляюць многія піонэры, і ён зусім ня першы ў атрадзе,—а на турніры атрадным узяў пятае месца. Усе гэта зацікавіла і я парашыў азнаёміцца з таленавітым шашачна-шахматным атрадам.

Шахматна-шашачны атрад.

Клюб атраду Працасьветы заўсёды поўны. Калі а пятай гадзіне ўвачары ён адчыняецца, адразу-ж запаўняецца піонэрамі, неорганізаванымі дзяцьмі і часьценька нават наведваецца комсамольцамі. Клюб ня толькі повен людзьмі,—ён поўны і працай. Заўсёды ўбачыш, як займаюцца зьвеньні, працуе пераплётны гурток, выпушчае насьценгазэту рэдколегія... Шмат працы.

Але шахматы і шашкі заўсёды ў асяродку ўвагі піонэраў.

Заўсёды за столікамі бачыш, як піонэры наглядаюць за змаганьнем двух «чэмпіёнаў». Тут пачуеш і аб тым, што піонэр Левінаў гэта атрадны «Мядкоў» (шашачны чэмпіён СССР), а Артабалеўскі—гэта «Капабланка» атраду... Ёсьць і «Ільлін-Жанеўскі». **Усё ёсьць.**

Вось піонэры наглядаюць за тым, як змагаюцца ў шашкі Левінаў і Мэнхін. Мэнхін ужо ўпарта апошнія месяцы стараецца выбіць з рук чэмпіёнства ў Левінава. Шэрагам добра згуляных партый, ён атрымаў назву другога іграка ў атрадзе. На апошнім лятучым турніры ён абагнаў Левінава на два ачкі і ўзяў першае месца. Вось чаму піонэры з такой цікавасьцю сочаць за тым, як праходзіць іх партыя.

А яна цячэ ня хутка. Абодва праціўнікі доўга думаюць, кожнай фігуры надаюць свой сэнс і толькі, калі ўсё прадумана, калі ня можа быць аніякіх памылак, робыцца ход. Партыю выйгрывае Левінаў,—яго «чэмпіёнства» пакуль трымаецца ўпарта.

Пасьля гульні абодва праціўнікі ажыўлена абмяркоўваюць тое як лепей абставіць клюб, без усякай варожасьці, без злых нотак у размовах. Гэта гаворыць аб тым, што барацьба за «чэмпіёнства» не адбіваецца на асабістых узаемаадносінах і атраднай працы.

Матч з «Лукішкамі».

Праз некаторы час шахматыстыя зьбіраюцца ў кутку. Пад кіраўніцтвам шахматыстага-комсамольца абмяркоўваецца матч на шахматах і шашках, які меў атрад з піонэр-комунай «Лукішкі». Гэты шахматны матч піонэры выйгралі з вынікамі з 6:1 у карысьць Працасьветы; шашачны 20—3 таксама ў карысьць сабе. Аб гэтым матчы гавораць многа—гэто была першае «міжнароднае» спаборніцта, з якога яны вышлі пераможнікамі.

Матч з «Лукішкамі» многаму навучыў. Напрыклад, піонэры даведаліся аб тым, што заўсёды трэба быць падрыхтаванымі да «кіндэрмату», добра ведаць канцы партыі, абароны ў пачатку.

Між іншым, у гэтым матчы **ўдзельнічаў акцябронак 7-мі год**—Айзік Рапапорт. Гуляючы ў шашкі на 9 дошцы, ён выйграў у аднэй 15 гадовай дзяўчынкі партыю, а другую ў дрэнным для сябе становішчы зьвеў у нічыю.

Удзельнічалі яшчэ піонэры ў раённым піонэрскім турніры, з 120 чалавек. На гэтым турніры Мэнхін узяў 8 месца. Выйсьці з 120 чалавек на 8-мае месца гэта—ня жарты, і Левінаў які выпаў куды далей, ня можа з гэтым супакоіцца.

Поўную перамогу атрымалі піонэры на шашачным турніры юнсэкцыі Працасьветы. Той-жа Мэнхін узяў другое месца.

Да гэтых пор савет атраду зварачваў мала ўвагі на гэту працу,—усім кіраваў толькі павадыр. Цяпер гэты зацікавіўся і савет.

Організаваўся шахматна-шашачны гурток і як вынік ... з піонэраў у часе юбілею спрытна «вадцёр насы» многім комсамольцам.

Вопыт атраду Працасьветы ў гэтай галіне цяпер скарыстоўваюць многія атрады гораду.

Н. Акцябрскі.



Міжнародны агляд.

Пілсудзкі заігрывае з магнатамі.

Перамовы з францускім урадам.

Пілсудзкі заігрывае з магнатамі.—Рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі знаходзяцца ў надзвычайна дрэнным становішчы. — Паход фашыстых супроць куцай дэмократыі ў Польшчы.—Працоўныя масы Польшчы пераканаліся ў немагчымасьці палепшыць сваё становішча пры буржуазным урадзе.—Савецкі ўрад прапануе Францыі падпісаць згоду аб даўгох і крэдытах.—Частка царскіх даўгоў будзе аддадзена толькі з атрыманьнем крэдытаў.

Зьбліжэньне Пілсудзкага з земляўласьнікамі.

Год таму назад у замку князя Радзівілы, самага буйнага абшарніка ў Заходняй Беларусі, адбыўся банкет, у якім бралі ўдзел маршал Пілсудзкі і міністры Мейтовіч і Негабытоўскі.

З гэтага моманту пачалося зьбліжэньне Пілсудзкага з зямельнымі і фінансавымі магнатамі.

Князю Радзівілу прадракалі, нават, што ён будзе міністрам замежных спраў.

Толькі моцнае нездавальненьне польскай грамадзкай думкі і большасьці сойму прымусілі Пілсудзкага адмовіцца ад гэтага намеру.

Але апошнія польскія газэты зноў паведамляюць аб тым, што Пілсудзкі далучаецца да польскіх магнатаў.

Гэтымі днямі ў маёнтку польскага пана Тарноўскага, адбылася нарада дзеячоў консэрватыўнай партыі.

На гэтай нарадзе з прамовай аб політыцы ўраду выступіў спэцыяльны пасланец Пілсудзкага, яго бліжэйшы прыяцель і саратнік палкоўнік Словэк.

На гэтай нарадзе між прадстаўніком Пілсудзкага і польскімі магнатамі быў паладжаны поўны хаўрус.

Як бачыце, Пілсудзкі ўжо больш паварачвае да элемэнтаў консэрватыўных, нават монархічных. Разганяючы сойм, гэты куцы парлямант, Пілсудзкі пачынае шукаць падтрыманьня ў тых, якія супроць усякай, зусім нязначнай, дэмократыі.

Асабліва ясна можна скласьці разуменьне буржуазнае «свабоды», калі мы паглядзім на падзеі «дэмократычнае» Польшчы адносна нацыянальных меншасьцяў.

Падзеі ў Заходняй Беларусі

зьяўляюцца самай лепшай сьведкай таго, якія свабоды дадзены панам Пілсудзкім насельніцтву.

Усім добра вядомы разгром Беларускай Грамады, арышт яе лепшых правадыроў. Гэта быў цяжкі ўдар па організацыі і па ўсім беларускім нацыянальна-рэволюцыйным руху на Захадзе.

Але ўдар гэты далёка не сьмяртэльны.

Калі арыштаваны сотні і калі яшчэ будуць арыштаваны тысячы членаў рэволюцыйных організацый, дык усё-ж гэта будзе малая доля ўсіх тых, хто стаіць у шэрагах вызваленьня працоўных з кіпцюроў белапанскага арла.

— Так адбылося з Беларускай Грамадой. Але абмежавацца тым, што ўжо ўтварыў Пілсудзкі, вядома ня можна.

Ён хоча яшчэ больш сьлез і крыві. Ён жадае быць сапраўдным фашыстым сапраўдным Мусаліні на польскі лад.

І вось у апошні час польская адміністрацыя пачала паход супроць беларускага радыкальнага друку.



Не абмяжоўваючыся простай конфіскацыяй газэт, польскія паны пачалі руйнаваць рэдакцыі.

Так, напрыклад гэтымі днямі ў рэдакцыі некалькіх беларускіх газэт зьявілася поліцыя і забрала ўсю маемасьць.

Цікава адзначыць і тое, што ў гэтым годзе польскім урадам забаронен прыём у Віленскі унівэрсытэт беларусаў.

Такім чынам, у «дэмократычнай» Польшчы, моладзь нацыянальных меншасьцяў знаходзіцца па-за сьценамі вышэйшай школы.

У надзвычайна цяжкіх умовах жыве сялянства Заходняй Беларусі.

Беднякі, у якіх ня было хлеба ў мінулым годзе пры існаваньні не ураджаю, папрадавалі свой ураджай паном і зараз самі апынуліся бяз хлеба.

Становішча сялян пагоршваецца яшчэ і тым, што ўрад бязьлітасна зьдзірае з іх непасільныя падаткі.

Становішча рабочай клясы Польшчы, і асабліва рабочых Заходняй Беларусі, надзвычайна дрэннае.

У зьвязку з гэтым прыкмячаецца ажыўленьне рабочага руху і экономічнай барацьбы пролетарыяту, а таксама і ўплыў комуністычнай партыі.

Дрэннае экономічнае становішча працоўных мас усе больш спрыяе зжываньню лагодных мараў і надзей на польскі ўрад.

Рэволюцыянізаваньне насельніцтва ідзе шпаркім крокам.

Далейшае павялічэньне фашысцкае дыктатуры Пілсудзкага, далейшае зьліяньне буржуазнага лягеру вядома будзе ісьці за кошт далейшага пагоршаньня становішча працоўных мас.

Але рэволюцыйная думка сярод пролетарыяту і беднага сялянства будзе жыць.

Комуністычная партыя, ня гледзячы на тое, што яна зараз загнана ў падпольле, будзе ўпарта весьці сваю працу.

У панскай Польшчы ня хопіць вастрогаў, каб пасадзіць у іх усе жывыя сілы, якія ідуць па рэволюцыйным шляху, па шляху да Савецкай Польшчы.

Савецкі ўрад за добрыя адносіны з Францыяй.

Савецкая дэлегацыя па перамовах з Францыяй перадала францускай дэлегацыі заяву Ракоўскага, нашага паўнамоцнага прадстаўніка ў Францыі, аб даўгох і крэдытах.

Тав. Ракоўскі напамінае, што яшчэ ў сакавіку абедзьве дэлегацыі прышлі да згоды аб разьмеры штогодніх уплат Савецкім Саюзам і вызначылі разьмер кожнага ўзносу ў 20 з лішнім мільлёнаў рублёў.

Што датычыцца пытаньня аб крэдытах, дык абедзьве дэлегацыі прызналі яшчэ ў мінулым годзе, што пытаньне даўгоў і крэдытаў павінна быць вырашана паралельна.

Заява падкрэсьлівае важнасьць крэдытаў, якія патрэбны для разьвіцьця экономічных зносін між Францыяй і СССР.

Крэдыты забясьпечаць францускай прамысловасьці новыя і неабходныя ёй рынкі збыту, спрыяючы, такім чынам, інтарэсам абедзьвых краін.

Савецкая дэлегацыя вызначыла разьмер крэдытаў ў 120 мільлёнаў даляраў (240 мільлёнаў рублёў), па 20 мільлёнаў даляраў штогодна на працягу 6 год, з пагашэньнем кожнай раты ў 6-цігадовы тэрмін.

Сваёй згоды адносна крэдытаў, француская дэлегацыя яшчэ не дала.

І вядома, Савецкі Саюз ня будзе плаціць даўгоў без атрыманьня крэдытаў, якія зьяўляюцца асноўнай умовай для іх уплаты.

Пакуль няма сталай згоды аб разьмерах гэтых крэдытаў, праца конфэрэнцыі ня можа лічыцца скончанай, а «поўная згода» дасягнутай.

Царскія даўгі намі прызнаны ня былі і ня будуць. Калі-ж Савецкі Саюз усё-ж такі згаджаецца ўплаціць частку гэтых даўгоў, то выключна з мэтай атрыманьня капіталаў, якія нам дапамогуць палепшыць соцыялістычнае будаўніцтва.

Гэта павінна раз і назаўсёды ўлічыць сабе француская буржуазія.

Алёнін.

„Вялікдзень“ шматпольля і „раданіца“ трохпалёўкі

Задачы акруговых, раённых і сельсавецкіх камісій па правядзеньню „Дню Ураджаю“

Дзе трэба наладжваць сельска-гаспадарчыя выстаўкі. Якія экспонаты прэміраваць

Ці распачалі хаты-чытальні і комсамольскія ячэйкі падрыхтоўку да асеньняга бытавога сялянскага сьвята?

Пішэце аб падрыхтоўцы.

Цэлы месяц будзе рыхтавацца маладая савецкая вёска да свайго асеньняга гаспадарчага сьвята «Дзень Ураджаю»

У гэты час кожны **раён, сельсавет, кожная вёска, комсамольская ячэйка, савецкая гаспадарка будуць падлічваць свае дасягненьні ў сельскай гаспадарцы, падагульняць вопыты, каб праз сельска-гаспадарчую выстаўку падзяліцца імі з сялянствам раёну.**

Нашым юнвяскорам, а таксама і ўсім чытачом, трэба прыняць самы актыўны ўдзел у ва ўсёй падрыхтоўчай працы уважліва прыглядзецца да ўсіх дасягненьняў, дасканала вывучыць шляхі, ідучы якімі дасягнутыя вынікі і **падрабязгова з фактамі напісаць аб усім гэтым у нашу газэту.**

«Чырвоную Зьмену» больш за ўсе цікавіць зараз, якія дасягненьні ў гаспадарках комсамольцаў, на комсамольскіх паказальных агародах, у працы сельска-гаспадарчых гурткоў, сельска-гаспадарчых комун і колектываў, пасёлкаў.

Зьмяшчаючы такі матар'ял, прысланы юнвяскорамі, на старонках нашай газэты, мы зможам падлічыць дасягненьні па ўсяму ЛКСМБ, а таксама дадзім адсталым ячэйкам шмат узораў для іх далейшай працы.

Сьвята правядзем падрыхтавана.

(Жыліхоўская ячэйка ЛКСМБ, Чырвона-Слабодзкага раёну).

З часу Кастрычнікавай рэволюцыі нашы вёскі значна перарадзіліся. Кожныя 9 двароў выпісваюць і чытаюць газэты.

На палёх у нас ужо зьявіліся буракі, кораньплоды; павялічыўся на палову засеў канюшыны, лубіну. Сяляне ўцяпляюць зімою хлявы. Амаль усе дзеці вучацца ў школе. Сялянства пачынае разумець дурман рэлігіі і парывае сяброўства з папом. Навука і аграномія ўсё больш і больш заваёўвае сымпатыю сялянства.

Толькі дзякуючы Кастрычніку, сяляне змаглі праявіць сваю ініцыятыву для пабудаваньня **сабе школ, пажарных дэпо, грамадзкіх кузьняў.**

Кастрычнік разьвязаў рукі і самадзейнасьці моладзі: **яна знаходзіць сабе ганаровае месца ў пабудове новага жыцьця. У нас сельсавет і іншыя грамадзкія організацыі складаюцца амаль выключна з моладзі. Комсамольцы кіруюць жыцьцём усяго сельсавету.**

Выгадзкім комсамольцам даручана **ўгаварыць насельніцтва пралажыць к сьвяту на вуліцы тратуары.** Матар'ял для гэтага адпушчаецца з лясоў мясцовага значэньня.

Ячэйка стараецца, каб у сьвяткаваньні 10-цігодзьдзя Кастрычніка, а разам з гэтым і ў сьвяткаваньні Дню Ураджаю прынялі ўдзел усе сяляне сельсавету.

Міхась Шпілеўскі.

30 дзён стараннай падрыхтоўкі.

Організацыйная падрыхтоўка сьвяткаваньня.

Для правядзеньня, як усёй падрыхтоўчай працы, таксама і організацыі самога сьвята Дзень Ураджаю будуць створаны ў акруговым цэнтры—**акруговыя камісіі**, у раённым цэнтры—**раённыя камісіі**, у сельсаветах—**сельскія камісіі** (апошнія могуць быць заменены сельска-гаспадарчымі камісіямі, якія існуюць пры сельсавеце). Камісіі будуць складзены з прадстаўнікоў **партыйных організацый, комсамольскіх, політыка-асьветных, зямельных, саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых і інш.**

У задачы акруговых камісій уваходзіць: **распрацоўка конкрэтнага пляну сьвяткаваньня па акрузе, адшуканьня матар'яльных сродкаў, інструктаваньне раённых камісій па пытаньням, зьвязаных з організацыяй сьвята, дастаўка раёнам матар'ялаў, організацыя выездаў шэфаў у дні сьвяткаваньня, популярызаваньне сьвята праз друк і інш.**

Задачамі раённай камісіі зьяўляюцца: **складаньне конкрэтнага пляну ў раёнах, абвяшчэньне сельсаветаў аб парадку сьвяткаваньня, організацыя раённых і дробна-раённых сельска-гаспадарчых выставак, кіраваньне працай па падрыхтоўцы сьвяткаваньня ў сельсаветах, устанаўленьне сувязі з шэфскімі організацыямі, організацыя ўрачыстых сходаў, увесяленьняў у дні сьвяткаваньня і інш.**

У сельскіх камісіях павінны прыняць самы гарачы ўдзел комсамольцы. У задачы гэтых камісій уваходзіць **шырокае апавяшчэньне насельніцтва аб сьвяткаваньні, дапамога ў правядзеньні раённых сельска-гаспадарчых выставак і інш.**

Правядзеньне сьвята.

Пачаткам сьвяткаваньня Дню Ураджаю вызначана **30-ае Кастрычніка.** Да гэтага тэрміну павінны быць скончаны ўсе падрыхтоўчыя працы камісій па організацыі сьвяткаваньня.

Галоўнейшымі формамі сьвяткаваньня ў раёне павінна зьявіцца **правядзеньне раённай сельска-гаспадарчай выстаўкі і дробна-раённых выставак на тэрыторыі некалькіх сельсаветаў, а таксама раздачай прэміяў.**

У сельсавеце павінен быць абавязкова наладжан **урачысты сход**, з дакладам раённага агранома аб **выніках дасягненьняў у сельскай гаспадарцы раёну, сельсавету і шляхох далейшай агра-культурнай працы, вызначанай на падставе ранейшых сялянскіх дасягненьняў, якія тут-жа трэба прадэмонстраваць.**

У кожным раёне ці сельсавеце ёсьць **асобы**, якія сваімі **патугамі**, сваёй **адданасьцю** прынесьлі многа **карысьці для ўздыму сельскай гаспадаркі.** У часе сьвяткаваньня ім трэба вынесьці **колектыўную падзяку**, іх працу трэба **ўшанаваць.**

Нельга абыйсьціся толькі адны́мі дакладамі. Хатам-чытальням, асабліва драмгурткам, якія існуюць пры іх, неабходна **падрыхтаваць агранамічныя суды, інсцэніроўкі, карнавальныя паходы, спэктаклі, кіно і інш.**, каб селянін сапраўды адчуваў вялікую ўрачыстасьць свайго бытавога сьвята.

У Дзень Ураджаю трэба асабліва падкрэсьліць ролю **злучнасьці рабочага з селянінам.**

Дробна-раённыя выстаўкі, або **сельсавецкія** трэба організоўваць толькі тады, калі на гэта ёсьць рацыя, калі адшуканы для гэтай мэты сродкі. Іх пажадана наладжваць на тэрыторыі савецкай гаспадаркі з прыцягненьнем вялікай колькасьці сялян-гаспадароў з суседніх вёсак.

Пры **ацэнцы экспанатаў** экспертныя камісіі павінны імкнуцца дакладна выявіць дасягненьні **саўхозаў, пасёлкаў, колектыўных гаспадарак, а таксама і індывідуальных гаспадарак, характарызуючыя найбольш прогрэсыўныя гаспадарчыя зрухі ў масавай сялянскай гаспадарцы, організацыі шматпольных севазваротаў, разьвіцьцё палявога травасеяньня, лёну, вырашчваньне насеньня кармавых траў, кораньплодаў, лубіну, ужываньне мінэральных угнаеньняў і інш.**

Фізкультурныя гурткі павінны падрыхтавацца да спаборніцтваў. Трэба гэтыя спаборніцтвы, якія будуць адбывацца прыкладна паміж фізкультурнікамі двух суседніх сельсаветаў наладзіць так, каб яны **зацікавілі моладзь, каб у іх сапраўды можна было бачыць карысьць фізкультуры для чалавечага організму.**

Зараз уся ўвага комсамольскіх ячэек павінна быць зьвернута на тое, каб **як найлепш правесьці гэта сьвята, каб надаць яму вялікую ўрачыстасьць, каб яго сьвяткавала,** ім радавалася ўсё працоўнае сялянства вёскі.

На пяскох і балоце.

(Славінская ячэйка ЛКСМБ, Дубровенскі раён, Аршанскай акругі).

Комсамолец Славінскай ячэйкі **Гарасім Елісеенкаў** у 1925 годзе атрымаў надзел **балоцістай і пясчанай** зямлі.

Елісеенкаў прывёз агранома, сумесна с ім разьбіў надзел на полі і потым узяўся за апрацоўку гэтай пустэчы. **Выпісаў шмат** сельска-гаспадарчай **літаратуры, чытаў яе і ўсе парады агранома пераносіў у працу на сваёй гаспадарцы.**

Сее ён **турнэпс, буракі, бручку, канюшыну. Ураджаі кожны год атрымоўвае на шмат лепшыя, чым суседзі-сяляне.**

Зараз Гарасім рыхтуецца да сельска-гаспадарчай выстаўкі.

Куляшоў В.

На балоце.

У вёсцы Заказінец, Смалявіцкага раёну організавалася мэліарацыйнае таварыства пад назваю „Новы шлях“.

Нядаўна рабілася вывучэньне гэтага балота гідратэхнікам. У гэтай працы комсамольцы прымалі вельмі актыўны ўдзел.

* * *

Грасьлі коні на балоце,
Захлыналіся ў гразі...
А цяпер, ўзяліся хлопцы
І давай яго сушыць.

Ты, Цімох, бяры рыдлёўкі,
Ды нясі-ж толькі хутчэй.
А мы, хлопцы, расьцярэбім,
Каб капаць было лягчэй.

Вось напрамак для канавы
Бяры хлопцы і капай,
Ды яшчэй-жа «Шляхам Новым»
Усю ваду ў раку спушчай.

Калі твань гэту асушым,
Тут і трактар затрашчыць.
Гэй, хутчэй капайце хлопцы,
Бо тут золата блішчыць.

М. Пятроўскі.

(Комсамолец з вёскі Заказінец).

ВУЧЫМСЯ ЎЛАДАЦЬ ЗБРОЯЙ.

Кожны комсамолец павінен быць добрым чырвонаармейцам.

Жлобінцы на манэўрах.

Як рыхтаваліся.

Пытаньне аб масавым ваенным паходзе Жлобінскай комсамоліі ўскалыхнула організацыю яшчэ ў чэрвені месяцы. Гэтая праца для нас была новай, і каб яе не правaліць, мы пачалі падрыхтоўку яшчэ задоўга да іх пачатку. Пры райкоме была складзена камісія для правядзеньня падрыхтоўчай працы.

Адразу-ж было паслана ў вясковыя комсамольскія ячэйкі паведамленьня аб рыхтуючыхся манэўрах.

Ячэйкі ўзяліся за працу. Праз райком было дагаворана з ваеннымі таварышамі, якія пачалі кіраваць вайсковай працай у ячэйках гораду. Адносіны комсамольцаў да заняткаў былі добрыя.

Кожны комсамолец імкнуўся набыць як мага больш ваенных ведаў. У часе падрыхтоўкі да манэўраў дасягнулі нават таго, што самыя недысцыплінаваныя комсамольцы прыходзілі акуратна ў вызначаны час на заняткі.

Вайсковыя заняткі прыцягнулі да сябе немалую частку і беспартыйнай моладзі і разам з гэтым разгарнулася праца і па вярбоўцы ў ТСА-авіяхіму.

У вёсцы, для правядзеньня вайсковых заняткаў, скарыстоўвалі дэмобілізаваных чырвонаармейцаў. Дагаварыліся з райбюро ТСА-авіяхіму, дасталі вінтоўкі і пачалі працу. У вёсцы Малевічы быў пабудаваны цір, стральба ў якім была ўнесена ў плян працы і кожную нядзелю гэты цір прыцягваў да сябе дзесяткі моладзі вёскі.

Для паглыбленьня практычнай працы па ваенізацыі, была наладжана пачоўка гарадзкіх ячэек КСМ.

Пасьля начоўкі праца па ваенізацыі яшчэ больш ажывілася. Былі устаноўлены дзяжурствы на зборных пунктах. Ячэйкі пачалі збор сродкаў на патроны. Некаторыя з іх сабралі па 10-15 рублёў.

Усе з нецярпеньнем чакалі манэўраў. Па ячэйках яшчэ за доўга да збору разасланы былі талёны на кожнага комсамольца: у якой ён часьці, роце, ўзводзе.

І вось чаканы дзень настаў, з 15 на 16 верасьня, а палове першай гадзіны, раздаўся гудок, за ім звон калаколаў.

Праз 45 хвілін уся гарадзкая організацыя ў зборы і начальнік манэўраў чытае загад № 1.

Назаўтра а 3 гадзіне райорганізацыя ў поўным зборы. А ў шэсьць стройнымі калёнамі пад гукі аркэстры рушыліся ў паход на доўгачаканыя манэўры.

М. Ле—ч.

СХЭМА ДЗЕЙНАСЬЦІ РУХОМЫХ ЗБОРАЎ КОМСАМОЛЬСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ.

УМОЎНЫЯ ЗНАКІ:
РУХ КАЛЁНЫ З ВАРТАЙ:
РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ РОТ:
НАСТУПЛЕНЬНЕ:

Ход манэўраў Жлобінскай організацыі. У правым куце малюнку з верху начальнік комсамольскага збору тав. Кірылаў. З левага боку малюнку ўнізу ваенком тав. Ісакаў.

Вынікі добрыя.

Жлобінская комсамолія была наэлектрызавана да манэўраў яшчэ за тры месяцы. Але тыя ўмовы і магчымасьці правядзеньня комсамольскіх манэўраў, якія былі ў нас, перашкаджалі іх своечасоваму правядзеньню.

Здавалася, вось-вось пойдзе дождж і манэўры трэба будзе на доўга адкласьці. Але такога выніку—вялікай вайсковай падрыхтоўкі--комсамольцы ня хочуць. Яны яшчэ з большай энэргіяй узяліся за падрыхтоўку да манэўраў, за вывучэньне ваеннай справы.

У выніку атрымалася тое, што манэўры былі праведзены з вялікім посьпехам. Праўда, гэтаму спрыяла вялікая ўвага, аказаная нам з боку Чырвонай арміі, райкому КП(б)Б і Райсавету ТСА-Авіяхіму. У час манэўраў выявілася добрая падрыхтоўка комсамольскіх ячэек і добрыя адносіны комсамольцаў да ваенізацыі.

Правядзеньне саміх манэўраў у працягу 24 гадзін, замацавалі вайсковую працу комсамольскіх ячэек, і яшчэ больш зацікавілі комсамольцаў справай ваенізацыі. Акрамя гэтага, манэўры спаялі організацыю ў адно цэлае і ажывілі, наогул, усю працу організацыі.

П. ІСАКОЎ.

Правяраем гатоўнасьць.

(Ячэйка ЛКСМБ Саўгандслужачых, г. Віцебск).

У справе ваенізацыі комсамольцаў, ячэйка Саўгандслужачых займае адно з першых месц, сярод астатніх ячэек г. Віцебску. Факты гавораць яскрава за сябе.

Па ініцыятыве аднаго з комсамольцаў ячэйкі, пры ячэйцы ТСА-авіяхіму складзен быў санітарны гурток, які працаваў пад кіраўніцтвам дахтароў «Чырвонага Крыжу». У гэты гурток было ўцягнута каля 40 жанчын, з іх шмат беспартыйных дарослых. Адзін набор ужо закончыў сваю працу, а зараз праведзен новы набор у гурток.

Усе комсамольцы і комсамолкі, па ячэйкавай пастанове абавязкова наведваюць: першыя—ваенны, а другія—санітарны гурток. Амаль што ўсе комсамольцы зьяўляюцца членамі ТСА-авіяхіму. У часе свайго юбілею, ячэйка сумесна з сатварыскай ваеннай часткай правяла ваенную гульню, па спэцыяльна выпрацаванай камандзірам баявой задачы (гульня з умоўным праціўнікам).

У часе правядзеньня 13-га МЮД ў бюро ячэйкі ўхваліла праверыць гатоўнасьць комсамольцаў. З гэтай мэты ўсе комсамольцы зусім нечакана атрымалі сакрэтнае паведамленьне аб начным зборы ля чыгуначнага вакзалу для «удзелу ў выкананьні сакрэтнага заданьня». Да пачатку гэтай гульні ніхто з комсамольцаў у сутнасьць яе ня быў пасьвечаны. Зьявіліся ўсе акуратна. З вакзалу накіраваліся ў казарму ваеннай часьці, там камандзір роты пагутарыў аб сучасных абставінах, а пасьля разьбіўкі хлапцоў на ваенныя атрады і дзяўчат на санітарныя, ваенным атрадам быў зачытан баявы загад аб выступленьні ў паход.

Атрад быў разьбіт на ўзводы, аддзяленьні, мелася разьведка, усе былі ўзброены вінтоўкамі.

Усю ноч (да 5 гадзін раніцы) братва з паднятым настроем ганялася за няіснуючым ворагам.

Па водгуку камандзіра, гульня прайшла вельмі добра.

Алесь Цыльштэйн.

Ніводзін вучань ня пойдзе ў сынагогу!

Конфэрэнцыя яўрэйскіх школьнікаў.

25-га верасьня адбылася Менская агульна-гарадзкая конфэрэнцыя вучняў яўрэйскіх школ.

Абмеркаваўшы пытаньні, якія сталі на парадку дню, конфэрэнцыя вынесла наступныя пастановы:

1. ЗАПРАСІЦЬ У БССР ДЭЛЕГАЦЫЮ ДЗЯЦЕЙ З ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

2. Організаваць фарпосты ў тых школах, дзе іх яшчэ няма.

3. Кожнаму вучню абавязкова чытаць піонэрскую пэрыодычную прэсу (газэту ці часопісь) і

4. Прыступіць да перавыбараў вучкомаў і фарпостаў.

Накошт яўрэйскіх рэлігійных сьвят конфэрэнцыя сказала наступнае:

НІВОДЗІН ВУЧАНЬ ЯЎРЭЙСКАЙ ШКОЛЫ НЯ ПОЙДЗЕ Ў СЫНАГОГУ І БУДЗЕ ВЕСЬЦІ АНТЫРЭЛІГІЙНУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ ПРАПАГАНДУ, ЯК СЯРОД БАЦЬКОЎ, ТАК І СЯРОД СВАІХ НЕСЬВЯДОМЫХ ТАВАРЫШОЎ.

Нарада профпрацаўнікоў сярод моладзі.

ЦК ЛКСМБ сумесна з ЦСПСБ склікаюць 16-га кастрычніка ўсебеларускую нараду прадстаўнікоў акругкомаў ЛКСМБ у акруговыя саветы профсаюзаў з наступнай абвесткай дню:

1) аб рабоце профсаюзаў па пытаньнях моладзі ў зьвязку з рацыяналізацыяй вытворчасьці; 2) аб тарыфнай рэформе для вучняў; 3) становішча беспрацоўя сярод падлеткаў і барацьба з ім; 4) аб працы сярод батрацкай і саўхозкай моладзі; 5) бягучыя справы.

ЦСПСБ прапанаваў усім АСПС накіраваць к паказанаму тэрміну на гэтую нараду аднаму работніку сярод моладзі—члена прэзыдыуму.

Лік школ расьце.

У гэтым годзе колькасьць школ па Менскай акрузе дасягае 920, што дае павялічэньне на 87 комплектаў у параўнаньні з мінулым годам.

Ва ўсіх школах Меншчыны налічваецца сёлета звыш 4000 вучняў.

Прыём у вячэрні рабочы тэхнікум.

Галоўпрофасьветы пастанавіў працягнуць тэрмін прыёму заяў у Менскі вячэрні рабочы тэхнікум да 15-га кастрычніка.

На вакантныя 50 месц будуць прыняты рабочыя з кваліфікацыяй ня ніжэй 7-га разраду і з асьветай у аб'ёме 4-х клясаў сямігодкі.

Пасьля трохгадовага курсу навучаньня, тэхнікум выпушчае высокакваліфікаваных майстароў і інструктароў па розных галінах вытворчасьці.

5 тысяч „шакамят“

Наркамасьветы пастанавіў пашырыць сетку існуючых у БССР вячэрніх школ сялянскай моладзі. Лік апошніх будзе сёлета даведзен да ста.

Усяго ў вячэрніх школах будзе ў гэтым годзе навучацца звыш 5000 батракоў і сялянскіх хлапцоў.

Індустрыяльная профтэхасьвета.

На пашырэньне індустрыяльнай проф тэхасьветы ў БССР у 1927-28 годзе асыгнавана 500 тысяч рублёў.

На гэтыя сродкі будзе пашырана сетка існуючых профтэхшкол і школ павышанага завадзкога навучаньня

Перавыбары студэнцкіх організацый.

Згодна пастановы ЦБ Пролетстуду, з 25-га верасьня па 15-е кастрычніка ва ўсіх ВНУ і тэхнікумах БССР праводзяцца перавыбары студорганізацый—профкомаў, выканбюро і студкомаў.

Профкомы выбіраюцца ў тых ВНУ, дзе ёсьць 75 процантаў студэнтаў—членаў профсаюзаў. Там-жа, дзе гэтых 75 процантаў няма, выбіраюцца толькі студкомы і выканбюро.

У гэтым годзе ўпяршыню да перавыбараў студорганізацый дапушчаецца з правам рашучага голасу і непрофорганізаванае студэнцтва.

Перавыбары праўленьняў клюбаў.

З 1-га да 15-га кастрычніка на Беларусі праводзяцца перавыбары праўленьняў клубаў.

Перавыбарчая кампанія ўвязваецца з падагульненьнем працы клюбаў да Кастрычніка.

КАСТРЫЧНІК ІДЗЕ.

Справа аздараўленьня працоўных.

Наркамат Аховы Здароўя БССР праводзіць двайную падрыхтоўку да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі.

У дні сьвята адчыняецца шэраг новых мэдыцынскіх установ: фізыка-тэрапэўтычны інстытут, аздаравіцельная пляцоўка для піонэраў у Менску, дыспансэр для сухотнікаў у Астрашыцкім Гарадку, санаторы для нэрвовых хворых у Полацку ды інш.

Ва ўсіх бальніцах, радзільных прытулках і дзіцячых ясьлях будзе палепшана кармленьне.

Акрамя таго, да 10-й гадавіны Кастрычніка выйдзе спэцыяльны нумар часопісі „Беларуская мэдыцынская думка“, у якім будуць выяўлены дасягненьні савецкай мэдыцыны ў БССР за 10 гадоў.

Альманах беларускай літаратуры.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі Белдзяржвыдавецтвам рыхтуецца да друку вялікі альманах беларускай літаратуры пасьлякастрычнікавага пэрыоду.

У складаньні альманаху прымуць удзел усе выдатныя беларускія пісьменьнікі: **Купала, Колас, Ц. Гартны, Бядуля; літгрупы „Маладняк“, „Узвышша“ і інш.**

Вулічная інсцэніроўка.

ЦК МОПР'у выпрацаваў плян свайго ўдзелу ў Кастрычнікавых урачыстасьцях.

Для членаў МОПР'у будзе організован вечар успамінаў з часоў грамадзянскай вайны і падпольнай работы, пры ўдзеле старых політкатаржан і політэмігрантаў.

Рыхтуецца грандыёзная вулічная інсцэніроўка з жыцьця політзьняволеных у капіталістычных краінах.

Пры ўсіх менскіх клюбах будуць утвораны куткі МОПР'у, адбіваючыя работу апошняга да 10-й гадавіны Кастрычніка.

Новыя дамы адпачынку.

Галоўсоцстрах адчыняе да 10-й гадавіны Кастрычніка 4 зімовыя дамы адпачынку ў розных акругах БССР.

У Менску будзе адчынен дом адпачынку на 55 чалавек, у Віцебску—на 65, Гомелі—40 і Бабруйску—20 чалавек.

Пастаноўка Галубка.

Тав. Галубок рыхтуе да 10-й гадавіны п'есу (напісана Галубком) „Краб“, якая малюе сучаснае прыгнечанае жыцьцё настаўніцтва Заходняй Беларусі.

Першая пастаноўка п'есы адбудзецца на ўрачыстым адчыненьні Народнага Дому ў Жлобіне.

Вечар „Юнгэр Арбэйтэр“.

— „Сэньня ў клюбе Карла Маркса вечар, прысьвечаны юбілею „Юнгэр Арбэйтэр“. Абавязкова прыходзь!“

— „Прыду, як-жа, гані білет!“

Такімі словамі абменьвалася 27-га верасьня яўрэйская рабочая моладзь ля сваіх варштатаў і машын.

* * *

Тав **Бараньнікаў**, які вітае газэту ад імя ЦК ЛКСМБ, жадае ей росту тыражу.

Далей выступаюць т. т. Ашаровіч, Аршанскі, Курцік, Прынц, Городокер і інш. Шмат цёплых слоў, гарачых прывітаньняў і разам з тым таварыскай крытыкі.

Але самае цікавае на вечары—гэта прывітаньні і падарункі газэце ад яўрэйскай рабочай моладзі асобных прадпрыемстваў.

Рабочыя шорнікі прыпаднесьлі рэдакцыі вуздэ сваёй работы „каб абуздаць усіх клерыкалаў, сыяністаў і эксплёатататараў рабочай моладзі“.

Рабочыя электростанцыі прыпаднесьлі вялізны молат „дзеля таго, каб разьбіць галавы ўсім замежным ворагам Савецкага Саюзу, якія спрабуюць напасьці на яго“.

І яшчэ шмат падарункаў адніх за другімі.

Вечар закончыўся добра-падрыхтаваным концэртам з удзелам хору клюбу імя Леніна, балетнага гуртку клюбу імя КІМ, струннага оркестру і г. д.

Я. З.

Група бліжэйшых супрацоўнікаў газэты „Юнгер арбэйтэр. Трэці зьлева адзін з адказных рэдактароў—тав. Сольц.

У тры радкі.

○ **Зачыніўся дом адпачынку ў Ждановічах**, праз які было прапушчана за летні сэзон 2500 чалавек.

○ 1-га кастрычніка пачнуцца **заняткі на ўсіх лікпунктах БССР.**

○ Пры мэдфаку БДУ **адчынілася новая клініка па вывучэньню зубных хваробаў.**

○ **У Гомелі заканчваецца пераабсталяваньне радыё-станцыі**, моцнасьць якой даводзіцца да 1500 кіловат.

○ У Беларускую Сельска - Гаспадарчую акадэмію ў гэтым годзе прынята **360 новых студэнтаў..**

○ **Будуецца 8 новых лазьняў** у розных мясцовасьцях Менскай акругі.

○ **З Нямеччыны вярнулася дэлегацыя Наркамзему БССР** на чале з Наркомам тав. Прышчэпавым.

○ У бягучым годзе **на будаўніцтва Асінастрою будзе патрачана 3.200.000 рублёў.**

○ **Заснавалася новае аб'яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў пад назвай „Беларуская Літаратурная Комуна“** у складзе 6 сяброў.

○ На вучоце юнсэкцыі Менскай біржы працы налічваецца каля **1500 беспрацоўных юнакоў.**

Што чытаць.

З. ПАВАРОТНЫ. «Комсамольскія вячоркі». БДВ. 164 ст. Цана 85 к.

Мы добра ведаем, што вячоркі зьяўляюцца адной з асноўных форм досугу вясковай моладзі. На вячорку ідуць ахвотна, з песьняй, з гармошкай, часта і з бутэлькай самагону...

Перад комсамолам паўстала вялікая і адказная задача: зьмяніць характар вячорак сялянскай моладзі. Апошнія неабходна зрабіць культурнымі цэнтрамі ў вёсцы, прыдаць ім сучасны, комсамольскі зьмест, пабудаваны на здаровым і вясёлым праводзеньні часу.

Аўтар рэцэнзуемай кніжкі і зрабіў першую спробу ў напрамку акамсамольваньня сялянскіх вячорак.

Зьмест зборніку даволі багаты і рознастайны: акрамя ўводнага мэтадычнага артыкулу, які тлумачыць, як наладзіць комсамольскую вячорку і выкарыстаць матар'ял кніжкі, мы тут знаходзім песьні як народныя, гэтак і комсамольскія, прыпеўкі, гульні, галаваломкі, фокусы, задачы, комсамольскі гумар, вясёлыя апавяданьні, анэкдоты і г. д.

Такая рознастайнасьць матар'ялу значна палягчае задачу організатара вячоркі і дае яму багаты выбар для праграмы. Апошнюю можна разьбіць на некалькі аддзяленьняў, дзе будуць і гульні, дэклямацыя, колектыўныя песьні, галоснае чытаньне, сьмяшлівыя сцэны і шмат чаго іншага.

Частка зьмешчанага тут матар'ялу акажацца ўжо знаёмай вясковай моладзі (народныя песьні і г. д.). Вось чаму карыстаньне зборнікам ня будзе прадстаўляць ніякай цяжкасьці.

Праўда, зборнік не пазбаўлен некаторых заганаў, шмат чаго ў ім не хапае. Ды гэта і зразумела, бо такая кніжка выдаецца на беларускай мове першы раз і зьяўляецца на нашым кніжным рынку амаль што адзінай.

Сярод усяго матар'ялу адсутнічаюць: ноты для гармоніку і сьпеваў; апісаньні скокаў з мэтодычнымі заўвагамі да іх; паказаньні аб тым, як падрыхтаваць для вячоркі вусную газэту. Апошняя наогул адсутнічае ў пляне комсамольскай вячоркі, які рэкомэндуецца аўтарам.

Усё-ж, ня гледзячы на адзначаныя недахопы, кніжка „Комсамольскія вячоркі“, **адыграе вялікую ролю ў справе ператварэньня старой, „самагоннай“ вячоркі ў новую комсамольскую, якая зможа задаволіць культурныя запатрабаваньні вясковай моладзі.**

Зьмешчаны ў зборніку матар'ял, за некаторымі выключэньнямі, **зможа быць дапасаваны і для гарадзкой вечарынкі**, організуемай для моладзі комсамольскай ячэйкай ці юнсэкцыяй.

Вось чаму зборнік „Комсамольскія вячоркі“ мы рэкомэндуем клюбам, юнсэкцыям, хатам-чытальням, політасьветпрацаўнікам, апоргам комсамольскіх ячэек і наогул усім, хто займаецца праводзеньнем культурна-масавай работы сярод моладзі.

Луцні.

ЗІМЕ--ФІЗКУЛЬТУРНАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ!

Гурткі, рыхтуйце лыжы і канькі.

Прыцягнем да спорту дарослых рабочых.

(Гутарка з намесьнікам старшыні ВСФКБ тав. Левам).

Фізкультарганізацыі скончылі сваю летнюю працу. Наша галоўная задача цяпер—ЗАХАВАЦЬ ОРГАНІЗАВАЎШЫЯСЯ ЎЛЕТКУ ГУРТКІ.

Саветы ФК, профсаюзы і асабліва комсамольскія організацыі павінны зрабіць усё магчымае, каб забясьпечыць гурткам магчымасьць добра працаваць.

Бязумоўна, мы ня можам знайсьці для ўсіх гурткоў памяшканьні, і таму высоўваем задачу, каб гурткі прыстасавалі сваю працу да маючыхся ўмоў. ТРЭБА СКАРЫСТАЦЬ ЛЫЖЫ, КАНЬКІ І НАОГУЛ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ.

У мэтах ваенізацыі гурткоў, мы прапануем організоўваць ПАХОДЫ НА ЛЫЖАХ. ВСФК намячае плян усебеларускіх лыжных спаборніцтваў, у якія ўвойдзе ЭСТАФЭТА НА ЛЫЖАХ ПА БССР.

НЯХАЙ ГУРТКІ ЗЬВЕРНУЦЬ УВАГУ НА ЎЦЯГНЕНЬНЕ Ў СВАЮ ПРАЦУ ДАРОСЛЫХ РАБОЧЫХ. Калі параўнаць фізкультарганізацыі нашыя і Захаду, дык мы ўбачым, што там больш дарослых рабочых (аб гэтым нам расказвалі прыехаўшыя чэха-славацкія спортсмэны).

Дзеля гэтай мэты трэба належным чынам прыстасаваць працу, увесьці цікавыя для ўсіх віды спорту: лыжы, барацьбу, гіры і інш.

Трэба за зіму падрыхтаваць кадр новых інструктароў. У СЬНЕЖНІ ВСФКБ ОРГАНІЗУЕ УСЕБЕЛАРУСКІЯ І НА МЯСЦОХ АКРУГОВЫЯ КУРСЫ ІНСТРУКТАРОЎ.

Мы расьцём. Фізкультурнікаў на Беларусі налічваецца ўжо 85 тысяч чалавек.

Па вёсках СТЫХІЙНА ЎЗЬНІКАЮЦЬ І ГІНУЦЬ СОТНІ ГУРТКОЎ БЕЗ НАЛЕЖНАГА АБСТАЛЯВАНЬНЯ І НАЛЕЖНАГА ІНСТРУКТАРСКАГА СКЛАДУ. Трэба даць ім добрых інструктароў і павялічыць матар'яльную базу.

Да зімовага сэзону мы маем 7 лыжных станцый. Гэта колькасьць недастаткова. Трэба адчыніць яшчэ столькі-ж.

У гэтым годзе ВСФКБ запрашае замежных спартсмэнаў-лыжнікаў, канькабежцаў, гірывікоў і баксёраў. Лыжнікі і канькабежцы прыедуць з Фінляндыі.

Сэзон абяцае быць цікавым.

Хто куды...



—Мае грошы тут.

ЭКРАН І СЦЭНА.

„Поэта і цар“.

(Кіно „Культура“).

1827 год. У цяжкіх матар'яльных абставінах жыў вялікі поэта Пушкін у Санкт-Пецярбурзе. Яго жонка—Наталія часта бывае ў Пэтэргофе на балах, якія наладжвае Мікалай І-шы. Імпэратар лёгка фліртуе з Наталіяй. Паручык—барон Георг Дантэс „бярэ прыклад“ з цара. Дантэс карыстаецца сымпатыяй Наталіі.

Мікалай І-шы часьценька даведваецца аб рэволюцыйных сатырычных вершах Пушкіна. Вядомасьць поэты, а таксама блізкасьць з Наталіяй, перашкаджае Мікалаю І-му сурова рэагаваць на гэтыя вершы. Аднак, цэнзура шэфа жандараў Бэнкэндорфа трымае ў сваіх руках усю творчую дзейнасьць Пушкіна.

Дантэс трымаецца думкі, што «добры раман з добрай жанчынай цэніцца ў «свете» больш, чым вялікая дыплёматычная перамога ці паядзінак» і ён, як можа, фліртуе з Наталіяй. Даведаўшыся аб гэтым, Пушкін выклікае яго на дуэль. Пасьля некалькіх інтрыг з боку Дантэса, дуэль адбылася. Пушкін ранен, і хутка паміране. Перад самай сьмерцю цар дасылае яму пісульку з наступным зьместам: „Мы больш ня сустрэнемся. Ведай, што аб тваёй жонцы і дзецях буду клапаціцца я“.

Гэта сюжэт фільму. Аднак, на жаль, трэба адзначыць, што тып Пушкіна паказан вельмі надворна—павярхоўна. **Ня бачна таго Пушкіна, вольнага поэты, які пісаў сьмелыя памфлеты на цара, няма глыбокага псыхолёгічнага аналізу.** Пушкін больш за ўсяе паказаны, як зайздросны муж—увесь фільм так пабудаваны каб падкрэсьліваць толькі гэтую рыску поэты. Няма і пушкінскага процівапастаўленьня цару, як гэта абяцае назва.

Глядзіш фільм—і здаецца, што рэжысэры зусім не жадалі застанавіцца на тыпе Пушкіна. Напрыклад, надпіс, дзе паказваецца ўезд Пушкіна ў Міхайлаўскае, кажа: „Устав от забот, Пушкин поехал отдохнуть...“ Ці гэта так? Чаму ня пішуць, што Пушкін уяжджаў у Міхайлаўскае пад уплывам траўлі супроць яго, паднятай „высшим светом“.

Гэты галоўны недахоп затушоўваецца цудоўнай пастаноўкай і гульнёй артыстых.

Усе кадры фільму дасканала прадуманы рэжысэрам, падаюцца вельмі яскрава і самабытна. Асабліва мастацка вроблены канец фільму—сьмерць Пушкіна (камень кінуты ў балота, ад якога пайшлі кругі па вадзе).

Трэба аддаць увагу і мясцовым сілам. Оркестр, які ілюструе фільм, падабраў матывы з оперы Чайкоўскага „Яўгэні Анегін“, што сільна ўзмацняе агульнае ўражаньне.

М. Т.

* * *

Фільм глядзелі з вялікім захапленьнем. Часта публіка „ілюстравала“ ход карціны сваімі заўвагамі.

Вельмі добрая пастаноўка. Пышна паказан палац цара—грошай не шкадавалі і гэта ня кепска.

Яскрава праходзіць перад вачыма жыцьцё Пушкіна ў Міхайлаўскім і яго сьмерць.

Фільм наогул каштоўны. Яго трэба пасунуць у рабочыя клюбы.

Леў Хвасьцюк.
(Аб'яднаная профшкола).

* * *

Фільм вельмі мастацка адбівае жыцьцё Пушкіна. Рэжысэр Гардзін сур'ёзна падышоў да распрацоўкі тэмы і ўважліва прасачыў за гістарычнай праўдай.

Але, калі глядзіш фільм, узьнікаюць некаторыя сумненьні. Напрыклад, незразумела роля цара. Ці быў ён віноўным у трагэдыі Пушкіна? Ці вінаваты ў гэтым Дантэс? Наогул, у чым трагэдыя Пушкіна?—Зразумела, ня ў тым, што яму зьмяніла жонка. Тут трэба было падыйсьці да пытаньня больш глыбока, больш праўдзіва.

Ня гледзячы на недахопы, фільм усё-ж такі зроблен „на яць“.

Добра падабраны выканаўцы—Чарвякоў, Валодзька і Тамарын.

Удалы грым, як Пушкіна, Гоголя, Даля і інш.

Я. Гарбацэвіч.
(Белпэдтэхнікум).

Што нам пакажа ІІ-гі Дзяржтэатр?

Тэатральны сэзон хутка пачнецца.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам аб тэатральным сэзоне 1927-28 г. ў Менску, дырэктар ІІ-га Дзяржтэатру тав. Красінскі паведаміў наступнае:

— Сэзон мы распачынаем у Менску 8-га кастрычніка, маючы 6 гатовых п'ес мінулага сэзону і 10—новых.

З пастановак мінулага сэзону мы дадзім наступныя: 1. **„Цар Максіміліян“**—народная драма ў 2-х дзеях. 2. **„Сон у летнюю ноч“**—комэдыя Шэксьпіра. 3. **„Вакханкі“**—трагэдыя Эўрыпіда. 4. **„У мінулы час“**—народная трагэдыя Бэна. 5. **„Астап“**—комэдыя Глобы і 6. **„Эрос і Псыха“**—сцэнічная аповесьць Жулаўскага (пераклад Купалы).

„Сон у летнюю ноч“ і **„Вакханкі“**—дзьве клясычныя п'есы пастаўлены па апошняму слову сцэнічнай тэхнікі. У п'есе **„Сон у летнюю ноч“** мы ўжываем **сьветавыя дэкорацыі.**

Гэтыя пастаноўкі зьявіліся добрай глебай для нашых акцёраў, якія змаглі тут выявіць сваё ўменьне, сваю высокую тэхніку.

„Астап“ і **„У мінулы час“**—дзьве бытавыя п'есы з жыцьця беларускай вёскі. Яны лёгкія для зразуменьня з боку свайго зьместу і цікавыя па сваім фабулам.

„Цар Максіміліян“ і **„Эрос і Псыха“**—гэта лябараторныя працы, цікавыя па свайму афармленьню. Для масавага гледача асаблівай вартасьці яны ня ўяўляюць.

У гэтым сэзоне мы яшчэ дадзім наступныя новыя пастаноўкі: 1. **„Апрамэтная“**—драматычная казка Шашалевіча. 2. **„Каля тэрасы“**—драма Грамыкі. 3. **„Мушка зялянушка“**—камэдыя артыстага Міцкевіча. 4. **„Анжэльле“**—мэлёдрама Гюго. 5. **„Воўк“**—драма Грамыкі. 6. **„Гайавата“**—паводле Лонгфэльле. 7. **Вечар беларускай комэдыі.** („Пінская шляхта“, „Мозны шляхцюк“ і «Чорт і баба»). 8. **Вечар замежнай мініацюры:** („Гавань“ — Мопасана. „Цырульнік з Бэрыагу“—Маля, «Пільны вартаўнік»—Старвантаса і „Два балбатуны“—яго-ж).

Таксама ў гэтым годзе мы мяркуем паставіць **спэцыяльную п'есу для моладзі—„Робін Гуд“.**

Першай пастаноўкай пойдзе п'еса **„Апрамэтная“.**

Затым ідуць **„Астап“** і **„Сон у летнюю ноч“.**

У 10-ю гадавіну Кастрычніка пусьцім п'есу Грамыкі **„Каля тэрасы“**, для пастаноўкі якой выехаў спэцыяльны рэжысэр з Масквы.

Цэны на білеты ў параўнаньні з мінулым сэзонам 1-га Бездзяржтэатру значна будуць зьніжаны.

Таксама будуць наладжаны спэцыяльныя спэктаклі для профсаюзаў і рабочай моладзі.

Тэатр ставіць сваёй задачай моцную сувязь з масамі. У першыя дні сваёй працы зробім пастаноўкі ў клюбе Ільліча на МББ чыгунцы і ў клюбе Саўгандслужачых.

Ад моладзі тэатр чакае ўказаньняў аб яго працы, месца для якіх павінна даць „Чырвоная Зьмена“, за якой будзем уважліва сачыць.

Н. А.

Куды пайсьці?

У кіно „Інтэрнацыянал“ дэмонструецца фільм з удзелам Джэкі Кугана—**„Фламанцкі хлопчык“.** Звыш програмы гастролі сатырыкаў **Браўнталяў (бацька і сын).** У кіно „Спартак“ ідзе комэдыя—**„Бітая катлета“.**

У кіно „Чырвоная Зорка“ звыш програмы выступае **ілюзыяніст Парчынскі, а таксама балетмайстар ленінградзкага тэатру „КРЫВОЕ ЛЮСТРА“—Ф. Палуянаў.**

Адказы чытачам.

Карпоўскаму. (№ 1089). Часопісь „Профрух“ зноў пачынае выдавацца з кастрычніка г. г.

С. М. (№ 1090). **Павадыр фарпосту ня можа быць адначасова і павадыром атраду.** Супроць гэтага выказалася ЦБ ЮП.

Найману. (№ 1091). **Вучком сямігодкі павінен выконваць усе пастановы школьнай рады.**

Каханоўскаму. (№ 1092). **Барадаўкі з рук можна зьняць ляпісам.**

На хвалі 500 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Саўнаркому БССР.

СЁНЬНЯ перадачы няма.

ЗАЎТРА перадаецца: 7 г. 00 хв.—**Гутарка па прыродазнаўству „Паходжаньне чалавека“**; 7,30—**Радыё-газэта № 167**; 8.15—**Гутарка аграномаў:** 1. Тэхніка сілосаваньня кармоў і 2. Машынізацыя сельскай гаспадаркі; 8.55—**„Беларуская Вёска“ па радыё**; 9.40—**Концэрт ці трансьляцыя.**

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.